ДУА “Сярэдняя школа №1 г.Сянно імя З.І.Азгура”



# Вучымся пісаць сачыненні

► У дапамогу вучню

## Як пісаць сачыненне

### Патрабаванні да сачынення

1.Адпаведнасць зместу работы тэме.
2.Лагічнасць, паслядоўнасць матэрыялу работы.
3.Суразмернасць частак сачынення(уступная і заключная часткі ~1/5 усяго тэксту, галоўная – 3/5 тэксту)
4.Глыбокая аргументацыя кожнай думкі.
5Уменне аналізаваць, абагульняць, рабіць вывады.
6.Стылістычная яркасць работы.
7.Пунктуацыйная,моўная, арфаграфічная граматнасць.

### Як працаваць над сачыненнем

1.Прадумаць тэму, вызначыць галоўныя раздзелы і іх змест.
2.Сфармуляваць галоўную думку сачынення.
3.Сабраць матэрыял для раскрыцця тэмы:
а)прадумаць думкі-доказы асноўнага тэзіса;
б)разабраць тэкст для аргументацыі сваіх доказаў (цытаты, вытрымкі);
в)размясціць сабраны матэрыял у лагічнай паслядоўнасці работы( ад галоўнага да другараднага), прадумаць лагічны пераход ад адной думкі да другой;
г)падабраць уступную і заключную часткі і саставіць разгорнуты план;
д)работа над чарнавым варыянтам сачынення.
4.Праверка работы па зместу.
5.Праверка арфаграфічнай, пунктуацыйнай,стылістычнай граматнасці работы.
6.Работа над чыставым варыянтам сачынення.
7.Выніковая праверка работы.



# Водгук

### Алгарытм напісання водгуку

***Водгук*** – выказванне ўражанняў, дзе аўтар дзеліцца сваімі думкамі аб творы, пры гэтым не ставіць мэту ўсебакова ахарактарызаваць змаст і мастацкую структуру. Водгук пішацца ад імя першай асобы.

**Кампазіцыйная схема:**

⇒ Уступ (тэзіс)
⇒ Доказ (аргумент)
⇒ Вывад.

**Жанр водгуку патрабуе:**

⇒ захаванне кампазіцыйнай стройнасці (уступ – асноўная частка – заключэнне);
⇒ звестак пра аўтара, яго ролю ў беларускай літаратуры;
⇒ характарыстыкі асобы лірычнага героя;
⇒ сваіх ураженняў, уласных адносін да твора;
⇒ аналізу вобразна-выяўленчых сродкаў, якія дапамагаюць зразумець стан лірычнага героя, яго духоўны свет;
⇒ выяўленне літаратурнага і культурнага кругагляду, цытат, спасылак на іншых аўтараў, іншыя творы на неабходную тэму;
⇒ арыгінальнага , яркага заключэння;
⇒ адсутнасць памылак.

**Памятка – парада для падрыхтоўкі і напісання эсэ**

Эсэ перадае індывідуальнае бачанне і ацэнку, расказвае аб нечым праз уласнае “я”.

Эсэ можа ўтрымліваць яфк апісанне з’яў, падзей, так і разважанні аўтара, яго роздум.

Эсэ мае свабодную кампазіцыю, успрымаецца як плынь свядомасці, думак.

Эсэ пішацца вобразнай, арыентаванай на размоўную, мовай.

Эсэ мае невялікі аб’ём.

**Алгарытм напісання слоўнікавага артыкула**

Устанавіць прамое лексічнае значэнне слова (праца з тлумачальным слоўнікам);

устанавіць паняційнае значэнне па акадэмічным слоўніку;

устанавіц паняційнае значэнне па літаратуразнаўчым слоўніку тэрмінаў;

гістарычны каментарый;

прывесці прыклады.

**Памятка напісання анатацыі**

У анатацыі павінна быць наступная інфармацыя:

карактія звесткі пра аўтара;

сцісла, але аб’ёмна перададзены змест твора;

аргументы, чым кніга бедзе цікавая чытачу.

Тэкст анатацыі мае быць не толькі пазнавальным, але і займальным, арыгінальным, каб зацікавіць патэнцыяльнага чытача (пакупніка).



## Этапы работы над сачыненнем

1.Пішыце сачыненне толькі па прачытаным Вамі творы.
2.Удумайцеся ў назву тэмы, вызначце асноўную думку, яе трэба будзе даказаць.
3.Удакладніце дату стварэння твора, гістарычныя падзеі, у час якіх адбываецца дзеянне.
4.Падабраўшы дадатковую літаратуру, прачытыйце пра аўтара і гэты твор, адзначце ўдалыя на Ваш погляд азначэнні і думкі.
5.Выразіце асабістыя адносіны да праблемы і героя.
6.Выбярыце тып маўлення (апавяданне, апісанне, разважанне) для Вашага сачынення.
7.Складзіце прыкладны план.
8.Не бойцеся коратка пераказваць змест тэксту, але выбярыце такія эпізоды, якія адказваюць на пытанні, вызначаныя Вамі ў дадзеным пункце плана.
9.Падбіраючы цытаты, памятайце, яны не павінны быць вельмі доўгія. Калі магчыма, прывядзіце выказванні крытыкаў ці вядомых пісьменнікаў пра гэты твор ці героя.
10.Напішыце чарнавік, прачытайце яго ўслых, зрабіце патрэбныя выпраўленні.
11.Праверце граматнасць. Не лянуйцеся звяртацца да слоўнікаў. Пазбягайце абаротаў і слоў, у значэнні і напісанні якіх сумняваецеся.
12.Звярніце ўвагу на афармленне сачынення. Падзел тэксту на абзацы павінен быць лагічна абаснаваны.
13.Перапішыце сачыненне, абавязкова перачытайце яшчэ раз, праверце, ці няма арфаграфічных і пунктуацыйных памылак.

## АФАРМЛЕННЕ ЦЫТАТ

**ЦЫТАТА** – гэта даслоўная вытрымка з выказвання або твора, прыведзеная аўтарам для пацвярджэння ці тлумачэння сваёй думкі.

Цытаты выдзяляюцца тымі ж знакамі прыпынку, што і простая мова з двукоссем:

*П. Глебка з поўнай падставай пісаў: "Лірычную плынь унёс у нашу празаічную мову М. Лынькоў."*

Калі цытата прыводзіцца ў скарочаным выглядзе, то на месцы скарачэння заўсёды ставіцца шматкроп'е:

*У нас любяць цытаваць цудоўныя радкі Якуба Коласа: "Мой родны кут, як ты мне мілы…"*

Калі скарочаная цытата стаіць пасля аўтарскіх слоў, то яна пачынаецца з маленькай літары:

*В. Бялінскі падкрэсліваў цесную ўзаемасувязь, якая існуе паміж думкай і словам: "…слова, – пісаў ён – покрыва, адценне, форма, адлюстраванне думкі, а думка ёсць сэнс, розум, значэнне слова."*

Калі скарочаная цытата стаіць у пачатку сказа, то яна пачынаецца з вялікай літары:

*"…Роднае слова – гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы свет," – справядліва ўказваў Якуб Колас.*

Цытата можа ўводзіцца ў аўтарскую мову і як частка сказа. Тады яна бярэцца ў двукоссе, але пішацца з малой літары:

*Паэт не тоіць сваіх пачуццяў, ён шчыра радуецца, што "ўсюды сонца залатое роўна ўсім свеціць", што на змену бацькам выходзіць маладая змена..*

Калі цытата – вершаваны тэкст, у якім захоўваюцца вершаваныя радкі і строфы арыгінала, то двукоссе звычайна не ставіцца:

*А мы сабе сеем і сеем*
*Пшаніцу, і радасць і кветкі,*
*Ачышчаным сеем насеннем*
*Шчаслівыя нашы палеткі.*

*Так пісаў у свой час наш вялікі народны паэт Янка Купала.*



# Памяткі

**Памятка да напісання сачынення – апісання**

Тэма твора;

агульнае ўражанне, пераважная каляровая гама;

пярэдні план малюнка, асноўныя вобразы, іх прасторавае і колеравае вырашэнне;

фон, дробныя дэталі;

ідэйная ўстаноўка аўтара.

**Алгарытм сачынення – апісання знешнасці чалавека**

Уступ. Агульнае ўражанне ад прадмета апісання, якое перадае асноўную думку.

Галоўная частка, у якой раскрываецца асноўная думка. Састаўныя часткі апісання знешнасці:

а) фігура, пастава, выгляд, валасы, нос і г.д.;

б) дзеянні, рухі, звязаныя з характарыстыкай састаўных частак апісання.

Заключэнне, у якім робіцца вывад пра чалавека, знешнасць яго апісваецца.

**Алгарытм напісання сачынення – разважання**

Сачыненне- разважанне мае строгую кампазіцыю: *уступ – асноўная частка – заключэнне*;

ва ўступе выкладаецца тэзіс – асноўная думка;

асноўная частка – разгортванне тэзіса;

заключэнне і ўступ паміж сабой цесна звязаны па сэнсе;

добра, калі для пацвярджэння сваіх думак будуць выкарастаны цытыты з твораў, якія вы анальзуеце;

упрыгожаць сачыненне цытаты з твораў сучасных пісьменнікаў, выказванні вядомых вучоных .